Маціеўскі, М. Ордэны Ігара Равінскага / М. Маціеўскі // Наша Талачыншчына. – 2004. – 20 сак. – С. 2.

ОРДЭНЫ ІГАРА РАВІНСКАГА

– У нашым калектыве сумленных большасць, – сцвярджае начальнік ДБУ-63 Мікалай Яшчук. – Але ёсць і такія, да якіх адносяцца з асаблівай павагай. У іх ліку і Ігар Равінскі. Ен быў воін-інтэрнацыяналіст, ардэнаносец.

Пра вайну ўАфганістане Ігар Данілавіч расказвае неахвотна. Яно і зразумела, каму хочацца ўспамінаць пра смерць, жорсткія кровапралітныя баі. Не раз рызыкаваў сваім жыццем сапёр Ігар Равінскі, расчышчаючы ад мін праходы для нашых байцоў. Духі так маскіравалі, закопвалі фугасы, што іншы раз і мінашукальнік мог памыліцца. Неаднойчы гінулі воіны, на змену ім прыходзілі новыя саперы.

– І мяне аднойчы параніла, – успамінае Ігар Данілавіч. – Праўда, не ад выбуху міны, а куля прабіла плячо. Давялося паляжаць у шпіталі, але хутка зноў быў у страі. Неаднойчы браў у рукі аўтамат, і кулямёт. На вайне як на вайне – калі не ты, то цябе знішчаць…

У многіх баявых аперацыях удзельнічаў Ігар Данілавіч – Педжыварскай, Джалалабадскай.

– Нас вельмі любілі афганцы. Асабліва дзеці. Мы прыносілі ім хлеб, іншыя прадукты, і яны заўседы ўдзячна казалі: «Спасибо, шурави...».

На той вайне Ігар Равінскі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалем «За бавыя заслугі». Яны – сведчанне салдацкага подзвігу гераізму. Ёсць у машыніста асфальтаўкладчыка ДБУ-63 і мірны ордэн. За актыўны ўдзел у будаўніцтве Мінскай кальцавой дарогі ён узнагароджаны ордэнам Айчыны 3-й ступені.

– Уручаў ордэн наш Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, – успамінае Равінскі, шчыра паціскаў руку, дзякаваў за працу. Такія хвіліны не забываюцца...

Вось які ён, Ігар Данілавіч Равінскі. Мужны воін, шчыры, заўзяты працаўнік. Радасна ад таго, што побач жывуць такія цудоўныя людзі.

М. Маціеўскі